# На тым тыдні...

✓**27 лістапада** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў рамках супрацоўніцтва гэтай установы з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, часопісам «Маладосць» прайшло адкрыццё літаратурна-дакументальнай экспазіцыі **«Залатая раніца беларускага адраджэння»**.

1920-я гг. – «залатое дзесяцігоддзе» – адзін з самых плённых перыядаў у развіцці нацыянальных літаратураў Савецкага Саюза. З-за трагічных перыпетыяў таго часу гэты перыяд яшчэ называюць расстраляным адраджэннем (ва ўкраінскім літаратуразнаўстве), расстралянай літаратурай (у беларускім). У літаратуру прыйшлі маладыя пісьменнікі, чыя творчая і грамадзянская свядомасць фармавалася на скрыжаванні дзвюх галоўных ідэяў – нацыянальнага адраджэння і рэвалюцыйнага пераўтварэння свету. Пісьменнікі гуртаваліся вакол часопісаў. Кожная суполка мела на мэце паказаць сваё бачанне развіцця мастацкага метаду і яго рэалізацыю ў літаратуры.

Экспазіцыя «Залатая раніца беларускага адраджэння» раскрывае літаратурны працэс Беларусі ў 1920-я гг. праз дэманстрацыю матэрыялаў, звязаных з галоўнымі літаратурнымі згуртаваннямі таго часу, – «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАПП. У фондах Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры захоўваецца шмат фотаздымкаў, дакументаў, лістоў, рукапісаў, кніжных выданняў і графікі тых часоў, што склалі аснову экспазіцыі. Змешчаныя таксама рэдкія дакументы з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, кніжныя выданні бібліятэчкі часопіса «Маладняк» з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Мерапрыемства прысвечанае сёлетнім пісьменнікам-юбілярам А. Бабарэку, М. Лынькову, А. Якімовічу, М. Хведаровічу, П. Трусу, А. Дудару, З. Аксельроду, С. Дарожнаму, В. Маракову, Л. Калюгу, М. Лужаніну, З. Бандарынай, А. Куляшову.



«Залатая раніца беларускага адраджэння»

✓**27 лістапада** ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры адкрылі выстаўку **«Станіслаў Манюшка. 18 гадоў кахання і творчасці ў Вільні»** з фондаў Музея тэатра, музыкі і кіно Літвы.

У 1836 г., прыехаўшы разам з дзядзькам Аляксандрам у Вільню, будучы кампазітар спынялецца ў доме Мюлераў, на вуліцы Вокечу. Тут ён знаёміцца з дачкой гаспадара Аляксандрай Мюлер. Яму – сямнаццаць гадоў, ёй – шаснаццаць. І сэрца С. Манюшкі засталося ў Вільні, сюды пісаў нарачонай лісты з Берліна, куды ў 1837 г. паехаў вучыцца, сюды вяртаўся на кожныя вакацыі. У 1840 г. Станіслаў і Аляксандра пабраліся шлюбам у антокальскім касцёле трынітарыяў. У Вільні Манюшкі радаваліся нараджэнню дзесяці сваіх дзяцей, тут жа перажылі страту трох. У Вільні кампазітар напісаў кантаты «Мілда», «Ніёла», чатыры «Вострабрамскія літаніі», вельмі папулярны «Хатні